# Ад аўтара

Дапаможнік змяшчае распрацоўкі паўрочных планаў для 10 класа на І паўгоддзе і мае на мэце дапамагчы настаўніку ў наладжванні адукацыйнага працэсу. Метадычныя матэрыялы распрацаваны згодна з абноўленым зместам адукацыі, вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (НІА, 2020), вучэбным дапаможнікам (Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 10 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з белар. і рус. мовамі навучання / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч [і інш.]; пад рэд. А. П. Бязлепкінай-Чарнякевіч, І. Д. Воюш. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020). Планы-канспекты ўрокаў размеркаваны адпаведна прыкладнаму каляндарна-тэматычнаму планаванню (2021).

Сістэма прапанаваных урокаў спрыяе паўнацэннаму ўспрыманню вучнямі мастацкага тэксту ў агульным, а таксама разуменню мікратэм і падтэксту. Праблемныя пытанні дазваляюць зацікавіць, стварыць праблемную сітуацыю, што садзейнічае раскрыццю зместу і асноўнай думкі твора.

Значная ўвага надаецца асэнсаванаму чытанню, аналізу і сінтэзу прапанаванага навучальнага матэрыялу. Апорныя схемы, табліцы, карты і іншыя наглядныя дапаможнікі дазваляюць фарміраваць у вучняў уменні сістэматызаваць, аналізаваць, параўноўваць і рабіць вывады.

Планы-канспекты змяшчаюць заданні, якія фарміруюць і рэалізуюць міжпрадметныя сувязі, пабудаваныя на веданні беларускай музыкі, скульптуры, мастацтва кіно.

У дапамогу настаўніку ў планы-канспекты ўключаны спасылкі на відэафільмы і музычныя творы (QR-коды), дадатак, які змяшчае літаратурныя творы для работы на ўроках. Наглядны матэрыял і матэрыялы для падрыхтоўкі прэзентацый можна знайсці па спасылцы:

https://drive.google.com/drive/folders/1Pxyn53y54wYlr5dXmxdDT10QDJvgXPpy?usp=sharing

Распрацаваныя ўрокі садзейнічаюць рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў беларускай літаратуры, фарміраванню духоўна-маральных каштоўнасцей.

Метадычныя распрацоўкі носяць рэкамендацыйны характар і разлічаны на творчае выкарыстанне. Настаўнік можа ўносіць карэктывы з улікам магчымасцей, узроўню падрыхтаванасці класа, а таксама індывідуальных асаблівасцей кожнага вучня.

*С. Ю. Кампанеец*

# УРОК 1

## Літаратура — спецыфічная форма пазнання жыцця народа, выяўлення мастацкага спосабу мыслення. Асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры

**Мэта:** мяркуецца, што вучні дадуць азначэнне паняццю «літаратура»; пазнаёмяцца з этапамі развіцця беларускай літаратуры; будуць адрозніваць прадстаўнікоў пэўнай эпохі даўняй літаратуры; змогуць пазнаць прадстаўнікоў новай беларускай літаратуры па партрэце; назавуць сацыяльна-палітычныя абставіны, якія спрыялі развіццю літаратуры першай паловы XX стагоддзя; пройдуць тэст па тэме ўрока.

**Задачы развіцця і выхавання асобы вучняў:** стварыць умовы для фарміравання і развіцця ўмення працаваць з тэкстам, аналізаваць, структурыраваць і параўноўваць інфармацыю, выказваць і аргументаваць свае думкі, фарміраваць пазнавальную цікавасць; садзейнічаць пазнавальнай актыўнасці вучняў.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для 10 класа; відэафрагмент па тэме ўрока; дыдактычны раздатачны матэрыял, рознакаляровыя алоўкі.

### Ход урока

### I. Арыенціровачна-матывацыйны этап.

❖ **Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.**

— Сёння ў нас незвычайны ўрок, бо мы адпраўляемся ў вельмі цікавае і няпростае падарожжа па неабсяжнай і шматколернай краіне «Беларуская літаратура 10 класа». Што патрэбна, каб вандроўка была цікавай і карыснай? *(Настаўнік слухае і прымае меркаванні вучняў, падводзіць да думкі, што ў першую чаргу трэба мець інфармацыйную навігацыю: ведаць, у якім напрамку будзем рухацца, з якой мэтай; мець уяўленне пра эпоху і знакамітых асоб, з якімі сустрэнемся.)*

— Давайце акрэслім маршрут, па якім будзем падарожнічаць. *(Настаўнік агучвае тэму ўрока.)*

❖ **Мэтавызначэнне.**

— Вызначым мэту сённяшняга ўрока. *(Настаўнік выслухоўвае прапановы і разам з вучнямі фармулюе мэты ўрока.)* Спадзяюся, што напрыканцы ўрока вы зможаце:

- параўнаць азначэнне паняцця «літаратура», пададзенае ў розных крыніцах;

- назваць этапы развіцця беларускай літаратуры;
- адрозніваць прадстаўнікоў пэўнай эпохі даўняй літаратуры;
- пазнаць прадстаўнікоў новай беларускай літаратуры па партрэце;
- назваць сацыяльна-палітычныя абставіны, якія спрыялі развіццю літаратуры першай паловы XX стагоддзя.
- прайсці тэст па тэме ўрока.

## II. Аперацыйна-пазнавальны этап.

❖ **Франтальная гутарка.**

— Мы ўжо згадвалі, што падарожнічаць будзем па краіне «Беларуская літаратура 10 класа». Паспрабуйце даць сваё азначэнне паняццю «літаратура». (*Вучні дзеляцца сваімі думкамі і меркаваннямі.)*

— Параўнайце ваша азначэнне паняцця «літаратура» з іншымі, пададзенымі ў розных крыніцах. Прапанаваныя азначэнні супярэчаць адно аднаму ці ўзаемадапаўняюцца?

**Літаратура:**

1) Спецыфічная форма пазнання жыцця народа, выяўлення мастацкага спосабу мыслення. (*Вучэбны дапаможнік*)

2) Творы пісьменнасці, якія маюць грамадскае і пазнавальнае значэнне. (*Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы*)

3) Сукупнасць пісьмовых і друкаваных твораў прыгожага пісьменства ў іх узаемадзеянні. (*Вучэбны дапаможнік*)

*(Вучні павінны прыйсці да думкі, што разгледжаныя азначэнні ўзаемадапаўняюцца.)*

❖ **Пастаноўка праблемнага пытання.**

— Ці згодны вы з думкай Джоржа Сантаяна, амерыканскага філосафа і пісьменніка, што задача літаратуры — ператвараць падзеі ў думкі? *(Настаўнік слухае, прымае першапачатковыя меркаванні вучняў і пакідае пытанне адкрытым.)*

❖ **Прагляд відэафрагмента па тэме ўрока.**

https://eior.by/upload/info-oso/bellit/10kl/БЛР10_0101.mp4

❖ **Праца ў групах.**

***1 група.*** Пазначце часавыя межы пэўнага этапу беларускай літаратуры. У кружок намалюйце вобраз-сімвал, які адпавядае дадзенаму перыяду.




***2 група.*** Суаднясіце прапанаваных гістарычных асоб з пэўным перыядам даўняй літаратуры (XI—XVIII стст.).

Сімяон Полацкі, Ефрасіння Полацкая, Васіль Цяпінскі, Кірыла Тураўскі, Сымон Будны, Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі.

*Прыкладны адказ:*

| | |
|---|---|
| *Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі* | 1. Літаратура Сярэдневякоўя (XI—XVст.) |
| *Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі* | 2. Літаратура эпохі Адраджэння (XVI ст.) |
| *Сімяон Полацкі* | 3. Літаратура эпохі барока (XVII—XVIII ст.) |
| | 4. Літаратура эпохі Асветніцтва (другая палова XVIII — пачатак XIX ст.) |

*Развіццю даўняй літаратуры садзейнічала прыняцце хрысціянства ў эпоху Сярэдневякоўя, з'яўленне друку ў эпоху Адраджэння, палітыка паланізацыі ў эпоху Асветніцтва.*

***3 група.*** Падпішыце партрэты паэтаў новай беларускай літаратуры. *(Дэманструюцца партрэты.)* Вызначце падзею, якая дала штуршок для развіцця новай беларускай літаратуры.

*Прыкладны адказ:*

*Ян Баршчэўскі, Кастусь Каліноўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Янка Лучына, Францішак Багушэвіч, Ян Чачот.*

*Падзея: Пасля паўстання Кастуся Каліноўскага было ўведзена абавязковае вывучэнне рускай мовы. Беларуская мова прайшла шлях ад вуснай гаворкі да выкарыстання ў друкаваных аўтарскіх творах.*

# Дадатак

## Урок 2

## КІРЫЛА ТУРАЎСКІ

### СЛОВА НА ВЯЛІКДЗЕНЬ

Радасць двайная ўсім хрысціянам і весялосць невымоўная свету дзеля свята, што сёння настала замест тугі таямніцы ранейшай. Гэтак, адправіўшы мужа ў дарогу, тужлівая жонка строгая з дзецьмі, але ж як вернецца муж нечакана — жонка весялосць невымоўную ўспрымае, і дзеці цешацца, абдораныя празмерна.

Што ж за туга таямніцы ранейшай? Заўчора Гасподзь наш Ісус Хрыстос, як чалавек, быў укрыжаваны, але як Бог, зацямніў Ён і сонца, і месяц крывавым зрабіў, і цемра над светам усім панавала. Як чалавек, Ён сканаў, ускрычаўшы, але як Бог, страсянуў зямлю, так што распалася нават каменне. Як чалавек, быў працяты праз рэбры, але як Бог, разарваў напалову Сам Ён заслону Старога Закону. Нібы ягня, сваю кроў праліваў ён за кроў ягнятаў, забітых ахвярна — гэтак прынёс Ён сябе ў ахвяру Богу-Айцу за збавенне для цэлага свету. Як чалавек, быў пакладзены ў магілу, і як Бог, алтар паганскай царквы асвяціў. [11, с. 43]

## Урок 4

## ФРАНЦЫСК СКАРЫНА

### ПРАДМОВА ДА ЎСЁЙ БІБЛІІ

*(Урывак)*

Біблія — грэчаскае слова, па-руску гэта азначае — кнігі. Так святы апостал Мацвей пачынае Хрыстова дабравесце: «Біблос генезеос Ісусу Хрысту», па-руску гэта значыць «Кніга народзін Ісуса Хрыста». Так з-за іх асаблівай значнасці можаце называць усе кнігі Старога і Новага Запавету, бо поўная Біблія ўсё гэта змяшчае...

Біблія дзецям і людзям простым — кніга для навучаня, настаўнікам і людзям мудрым — для захаплення.

Біблія — дзівосная рака! Яна бывае мелкай, і нават авечка можа перайсці! Але адначасна і глыбокай, калі і слон змушаны плысці цераз яе! У гэтай кнізе — пачатак і канец усёй існуючай мудрасці, бо толькі праз яе можна спасцігнуць Бога-усетрымальніка! У гэтай

кнізе — усе законы і правы, якімі карыстаюцца людзі ў зямным жыцці! У гэтай кнізе — усе лякарствы душэўныя і цялесныя разам знойдзеце! Тут — навучанне філасофіі дабранраўнае: як Бога любіць для самога сябе і для бліжняга свайго! Тут — справа ўсялякага збору людскога і гораду, якія праз веру, ласку і згоду паспалітую дабро памнажаюць. Тут — поўнае навучанне сямі навук вызваленых!

Жадаеш ведаць Граматыку, ці, па-нашаму кажучы, грамату, якая вучыць правільна чытаць і гаварыць, — звяртайся да Бібліі. Чытай у ёй кнігу «Псалтыр».

Наважышся асвоіць Логіку, што вучыць пры дапамозе аргументаў адрозніваць праўду ад хлусні, — чытай «Кнігу святога Іова» або «Пасланні святога апостала Паўла».

Задумаеш авалодаць Рыторыкай, якая ёсць само Красамоўства, — чытай кнігі Саламонавы. Гэта ўсё навукі славесныя... [11, с. 89]

## Урок 10

### ЯН ЧАЧОТ

#### ДА МІЛЫХ МУЖЫЧКОЎ

Ды і я вам памагу
    Песеньку спяваці,
Ды і я ж між вамі ўзрос
    Пры бацьку і маці.

І мне Бог на свеце даў
    Гора гараваці,
Штобы лепш я вас любіў
    І ўмеў спагадаці.

Ой, што ж вы напелі тут,
    Ды якога дзіва!
Шкода, што на голас ваш
    Старонка драмліва.

Але як прачнецца з сну
    Гэта Дабрадзейка,
Пэўна, будзе слухаць вас
    Лепш, як салавейка.

Будзем колісь так і мы,
    Як тыя гуралі,
Што пан даў ім есць і піць,
    Яшчэ й грошы бралі.

## Спіс выкарыстаных крыніц


**1.** Беларуская літаратура: вучэб. дапаможнік для 10 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч [і інш.]. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020. — 294 с.

**2.** Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.knihi.com. — Дата доступу: 14.09.2021.

**3.** Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень). — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020.

**4.** Единый информационно-образовательный ресурс // Общее среднее образование [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://eior.by. — Дата доступу: 14.09.2021.

**5.** З кутка жаданняў: вершы, паэмы, п'есы : для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту / уклад. В. Шніпа ; прадм. В. Максімовіча. — Мінск: Маст. літ., 2009. — 446 с.

**6.** *Колас, Я.* На ростанях: Трылогія : для старэйшага школьнага ўзросту / Я. Колас. — Мінск: Маст. літ., 2000. — 704 с.

**7.** *Лазарук, М. А.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: дапаможнік для настаўнікаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. — Мінск: Нар. асвета, 1983. — 191 с.

**8.** *Ляшук, В. Я.* Вывучэнне творчасці Якуба Коласа ў школе : дапаможнік для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. Мінск: Аверсэв, 2006. — 320 с.

**9.** Мой народ, мая Айчына: зборнік празаічных твораў для вывучэння беларускай літаратуры ў 10 класе : для старэйшага школьнага ўзросту. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2021. — 448 с.

**10.** Светлых дзён хараство: зборнік паэтычных твораў для вывучэння беларускай літаратуры ў 10 класе / уклад. А. Спрынчан. — Мінск: Маст. літ., 2021. — 334 с.

**11.** Старажытная беларуская літаратура: зборнік / уклад. «Выдавецтва «Вышэйшая школа». — Мінск: Выш. шк., 2010. — 382 с.

**12.** *Старычонак, В. Дз.* Як правільна пісаць сачыненні па беларускай мове і літаратуры / В. Дз. Старычонак. — Гродна: Выд. Ілюшы В. Мельнікава, 1997. — 31 с. — (У дапамогу абітурыентам і школьнікам).

**13.** Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. — Мінск: БелЭН, 2005. — 784 с.

# Змест

*Ад аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1

Урок 1. Літаратура — спецыфічная форма пазнання жыцця народа, выяўлення мастацкага спосабу мыслення. Асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры . . . . . . . . . 2

Урок 2. Літаратура эпохі Сярэдневякоўя (XI—XV стагоддзі) . . . . 7

Урок 3. Літаратура эпохі Адраджэння . . . . . . . . . . . . . 11

Урок 4. Францыск Скарына. Развіццё беларускага кнігадрукавання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

Урок 5. Літаратура эпохі барока . . . . . . . . . . . . . . . 22

Урок 6. Літаратура эпохі Асветніцтва . . . . . . . . . . . . 28

Урок 7. Навучальнае сачыненне-разважанне па адной з прапанаваных тэм: «Што дала мне даўняя літаратура?», «Герой літаратуры Адраджэння: утопія ці будучыня?», «Маральныя ўрокі даўняй літаратуры» . . . . . . . . . . . . . 33

Урок 8. Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX стагоддзя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

Урок 9. Рамантызм у еўрапейскім і беларускім мастацтве слова канца XVIII — першай паловы XIX стагоддзя . . . . . . 41

Урок 10. Ян Чачот. Вершы «Покуль сонца ўзыдзе...», «Да мілых мужычкоў», «На прыезд Адама Міцкевіча» . . . . . . . . . . 45

Урок 11. Францішак Багушэвіч. Паэма «Кепска будзе!» . . . . . . . 49

Урок 12. Францішак Багушэвіч. Паэма «Кепска будзе!» . . . . . . . . 53

Урок 13. Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя . . . . . . . 57

Урок 14. Цётка. Вершы «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора» . . . 62

Урок 15. Ядвігін Ш. Апавяданне «Дуб-дзядуля» . . . . . . . . . . 69

Урок 16. Янка Купала. Драма «Раскіданае гняздо» . . . . . . . . . 74

Урок 17. Янка Купала. Драма «Раскіданае гняздо» . . . . . . . . . . 78

Урок 18. Якуб Колас. Трылогія «На ростанях»: гісторыя напісання і праблематыка, аўтабіяграфізм твора, яго сюжэтныя і кампазіцыйныя асаблівасці . . . . . . . . . . . . . 84

Урок 19. Жанравая спецыфіка аповесці «У палескай глушы». Асаблівасці вобразнай сістэмы . . . . . . . . . . . . . . 91

Урок 20. Жанравая спецыфіка аповесці «У палескай глушы». Асаблівасці вобразнай сістэмы . . . . . . . . . . . . . . 97

Урок 21. Майстэрства Коласа-празаіка. Месца і значэнне творчасці Якуба Коласа ў беларускай літаратуры . . . . . . . . 103

Урок 22. Максім Багдановіч. Вершы «Песняру», «Кніга», «Летапісец» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Урок 23. Максім Багдановіч. Вершы «Мяжы», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Урок 24. Алесь Гарун. Вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
Урок 25. Беларуская літаратура 1920—1930-х гадоў: агляд . . . . . 128
Урок 26. Максім Гарэцкі. Апавяданне «Літоўскі хутарок» . . . . . . 135

*Дадатак* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142

*Спіс выкарыстаных крыніц* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157